# Традыцыйны беларускі касцюм на памятных манетах: этнічны маркер і мастацкі вобраз



**Марыя ВІННІКАВА**

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, кандыдат мастацтвазнаўства, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: marya_vinnikova@tut.by

У 2016 г. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь звярнуўся ў Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – Цэнтр) з прапановай распрацаваць навуковае абгрунтаванне для серыі памятных манет «Беларускі касцюм», а таксама падрыхтаваць аналітычныя даведкі і ілюстрацыйныя матэрыялы, неабходныя для выканання дадзенага праекта. Выканаўцай з боку Цэнтра стала старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат мастацтвазнаўства Марыя Віннікава. Дызайнерская распрацоўка манет была даручана мастачцы банка Аксане Навасёлавай.

Пастаўленыя задачы былі цікавымі, але няпростымі. Выява на манеце павінна была стаць своеасаблівым этнічным маркерам, адпавядаць менталітэту народа і перадаваць адметнасць і мастацкую вартасць традыцыйнага беларускага касцюма. Таму было вырашана засяродзіцца на тых характэрных рысах, якія вылучаюць традыцыйны касцюм беларусаў сярод адзення іншых народаў, надаюць яму выразнасць і этнічную непаўторнасць. Такія рысы больш за ўсё ўвасобіліся ў святочных комплексах адзення замужніх жанчын, якія ўжываліся ў канцы XIX – пачатку XX ст. Іх прынята называць строямі. Яны складаліся з саматканага, у асноўным ільнянога, адзення і завяршаліся старажытнымі галаўнымі ўборамі ручніковага тыпу. Гэтыя ўборы выраблялі з кавалкаў тонкага белага палатна даўжынёй ад 250 да 450 сантыметраў, шырынёй – ад 25 да 65 сантыметраў. У розных месцах Беларусі яны адрозніваліся якасцю палатна, характарам аздаблення і мелі розныя назвы – *«наме́тка», «намі́тка», «намёт», «плат», «сарпа́нак»*. Менавіта такія ўборы, адпаведным чынам завітыя на галовах жанчын, выяўлялі іх этнічную прыналежнасць і падкрэслівалі мясцовыя адметнасці ўсяго строю.

Паколькі патрэбна было падрыхтаваць матэрыялы для трох памятных манет, з’явілася прапанова паказаць традыцыйныя жаночы касцюм трох гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі – тых, дзе ён доўга ўжываўся ў сваім натуральным асяроддзі і захоўваў яскравыя мясцовыя рысы. Зыходзячы з адзначаных крытэрыяў для выяў на манетах былі выбраны наступныя жаночыя строі: кобрынскі, які бытаваў на тэрыторыі Заходняга Палесся; калінкавіцкі, характэрны для Усходняга Палесся; старадарожскі, што адлюстроўваў традыцыі Цэнтральнай Беларусі.

Паводле свайго вобразнага вырашэння **кобрынскі жаночы строй** – адзін з самых адметных на Беларусі. Ён вызначаўся выразнай пластыкай формы, зграбнасцю сілуэта, стылістычнай цэласнасцю дробнай геаметрычнай арнаментыкі, далікатна ўведзенай у рытмічныя кампазіцыі з вузкіх чырвоных палос. Асаблівую грацыёзнасць жаночай постаці надаваў галаўны ўбор *плат*, выраблены з доўгага шырокага кавалка вельмі тонкага кужэльнага палатна. Ён свабодна

ахутваў галаву і плечы жанчыны. Яго левы канец праходзіў пад падбародкам, закрываў шыю і грудзі, перакідваўся цераз правае плячо і замацоўваўся шпількай на галаве. Доўгім белым пакрывалам ён струменіўся па спіне. Правы канец, складзены ў вузкую паласку, утвараў спераду доўгую пятлю, праз якую праходзіў левы канец, затым падымаўся ўверх і замацоўваўся на галаве вузкім абручыкам, які нагадваў німб. У святочныя дні пад гэты абручык падтыкалі кветкі або пяро паўліна.

**Калінкавіцкі жаночы строй,** які бытаваў на тэрыторыі сучасных Калінкавіцкага і Светлагорскага раёнаў Гомельскай вобласці, – яркі прыклад традыцыйнага касцюма Усходняга Палесся. Яму ўласцівы высокая дэкаратыўнасць, шырокі дыяпазон выкарыстаных сродкаў аздаблення: розныя тэхнікі ўзорыстага ткацтва, вышыўкі, пляцення, аплікацыйныя нашыўкі, а таксама арганічнае ўключэнне інавацыйных элементаў крою і аздаблення ў старажытную кампазіцыйную аснову касцюма. Строй завяршаўся багата аздобленай на канцах і своеасаблівa завітай на галаве *наме́ткай.*

**Старадарожскі жаночы строй** – адзін з самых цэльных і дэкаратыўна насычаных комплексаў адзення Цэнтральнай Беларусі. Ён уражвае багаццем складаных шмат’ярусных арнаментальных кампазіцый, што запаўняюць значную частку рукавоў і палікоў сарочкі, падола фартуха, шырокімі бардзюрамі ўпрыгожваюць канцы ручніковага галаўнога ўбору – *намёта.* Пры аздабленні гэтых прадметаў адзення перавагу аддавалі старажытным, вельмі працаёмкім тэхнікам вышыўкі – *«набо́рам», «насці́лам», «мярэ́жаннем»*; краі абшывалі махрамі і карункамі ручнога вырабу.

Такім чынам, згодна з тэхнічным заданнем былі выбраны тры характэрныя варыянты беларускага традыцыйнага жаночага касцюма, падрыхтаваны і перададзены ў Нацыянальны банк неабходныя для працы навуковыя матэрыялы і ілюстрацыі. Аднак пры непасрэднай рабоце над эскізамі манет мастачцы спатрэбіліся дадатковыя фотаздымкі, для чаго былі арганізаваны фотасесіі. Іх мэта – стварыць і зафіксаваць на фота найбольш выразныя мастацкія вобразы вызначаных жаночых строяў.

Для гэтага былі падабраны і падрыхтаваны пэўныя аўтэнтычныя кампаненты адзення кожнага строю і выбрана мадэль з адпаведнымі параметрамі фігуры і характэрнымі рысамі твару.

Фарміраванне дакладнага вобраза кожнага строю адбывалася за кошт мастацка-пластычнага мадэлявання адзення і галаўнога ўбору непасрэдна на фігуры мадэлі.

У якасці мадэлі выступіла навуковы супрацоўнік Цэнтра Жанна Жыхарка. Стварэннем навукова абгрунтаванага мастацкага вобраза займалася Марыя Віннікава. Фотафіксацыя вялася Аксанай Навасёлавай і Марыяй Віннікавай.

Каб прадставіць мастачцы дастаткова поўны матэрыял для работы, падчас фотасесій было зроблена шмат фо-

Малюнак 1



*Мадэль у кобрынскім строі канца XIX – пачатку XX ст. Фота М. Віннікавай*

Малюнак 2




Аверс Рэверс

*Памятная манета з выявай кобрынскага строю. Медна-нікелевы сплаў. Дызайн А. Навасёлавай*

Малюнак 3



*Мадэль у старадарожскім строі канца XIX – пачатку XX ст. Фота М. Віннікавай*

Малюнак 4



*Мадэль у калінкавіцкім строі канца XIX – пачатку XX ст. Фота А. Навасёлавай*

таздымкаў кожнага строю ў розных ракурсах. Ішлі пошукі выразных сілуэтаў, прапарцыянальных суадносін аб'ёмаў і колеравых спалучэнняў. Паводле задумы мастачкі, абавязковымі былі фатаграфіі строяў у фас і профіль, у поўны рост і партрэтныя. *Малюнкі 1, 3, 4* дапамагаюць атрымаць уяўленне аб кожным з выбраных строяў.

Акрамя саміх строяў фіксаваліся варыянты іх арнаментальнага аздаблення, якія потым былі ўведзены мастачкай у агульную кампазіцыю манет.

Наступным, вельмі адказным і складаным, этапам была работа над эскізамі, падчас якой падтрымлівалася сувязь з мастачкай, карэктна, каб не перашкаджаць дызайнерскай задуме, уносіліся прапановы наконт асаблівасцей кожнага строю. Творчы працэс няпросты. Ён патрабуе ад мастака і таленту, і ведаў, і прафесійнага майстэрства.

На дадзены момант распрацаваны эскізы дзвюх манет, якія дакладна перадаюць асаблівасці кобрынскага і калінкавіцкага строяў. Выкананыя ў адзінай стылістычнай манеры, яны маюць лаканічны і выразны аверс з пагрудная выявай жанчыны ў профіль. Этнічную і мастацкую адметнасць вобразу надае адпаведна завіты і аздоблены жаночы галаўны ўбор. Рэверс манет вылучаецца па-мастацку багатай распрацоўкай выяў: строй на ім адлюстраваны ў поўны рост на фоне характэрнага для яго арнаменту. Выхад сілуэта жанчыны за ўнутраны контур поля манеты надзяляе фігуру асаблівай значнасцю і велічнасцю *(малюнкі 2, 5)*.

Манеты выпускаюцца ў двух варыянтах: матэрыялам для манет наміналам 1 рубель з'яўляецца медна-нікілевы сплаў; манеты наміналам 20 рублёў адчаканены са срэбра. У мастацкае вырашэнне рэверса срэбных манет уводзіцца чырвоны колер, характэрны для беларускага народнага арнаменту. На сённяшні дзень ужо абвешчана аб выхадзе манеты з выявай кобрынскага строю.

Дарэчы будзе даць невялікую інфармацыю пра музейную калекцыю, з якой паходзяць беларускія народныя строі, выбраныя для ўвасаблення на памятных манетах. Яны былі скамплектаваны з прадметаў музейнага збору аддзела старажытнабеларускай культуры

Малюнак 5




Аверс Рэверс

*Эскіз памятнай манеты з выявай калінкавіцкага строю. Дызайн А. Навасёлавай*

Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, які ўваходзіць у склад Цэнтра. Асноўная іх частка ўзята з калекцыі «Народнае мастацтва Беларускага Палесся», з'яўленне якой у акадэміі навук заслугоўвае спецыяльнай адзнакі.

Гісторыя дадзенай калекцыі пачалася ў 1991 г., калі ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору звярнулася кіраўніцтва Маладзёжнага творчага аб'яднання «Тэмп» з прапановай сабраць калекцыю беларускага народнага касцюма і тэкстылю з мэтай выставачнай дзейнасці і папулярызацыі беларускага народнага мастацтва. Ідэя такога збору была падтрымана Міністэрствам культуры Беларусі, якое выдала дазвол на яго ажыццяўленне. На працягу летніх месяцаў 1991 г. членамі часовага творчага калектыву – навуковымі супрацоўнікамі Вольгай Фадзеевай, Паўлам Церашковічам і аўтарам дадзенага артыкула – быў наладжаны шэраг экспедыцый, падчас якіх па спецыяльна распрацаванай праграме збіраліся прадметы беларускага народнага адзення і тэкстылю, некаторыя побытавыя рэчы. Удзельнікі экспедыцый добра разумелі, што ўсе гэтыя каштоўныя артэфакты беларускай народнай культуры ў хуткім часе, з адыходам з жыцця іх стваральнікаў і носьбітаў, могуць быць страчаны. Таму не толькі набываліся прадметы, але і збіралася важная інфармацыя пра асаблівасці іх вырабу, спосабы нашэння розных частак адзення. Менавіта тады ў беларускіх вёсках нам давялося сустрэць жанчын сталага ўзросту, якія яшчэ памяталі і маглі паказаць мясцовыя спосабы нашэння традыцыйных жаночых галаўных убораў. Гэта дало пачатак новаму ўзроўню вывучэння традыцыйнага беларускага касцюма, што дазволіла сёння годна прадставіць яго на памятных манетах.

Адпаведна папярэдняй дамоўленасці набыты ў экспедыцыях матэрыял быў перададзены на адказнае захаванне ў аддзел старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, дзе адразу правялі навуковую і санітарна-рэстаўрацыйную апрацоўку ўсіх прадметаў калекцыі. У пачатку 1992 г. у Рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў прайшла выстаўка «Традыцыйны касцюм Беларускага Палесся», пасля якой калекцыя зноў была вернута ў аддзел старажытнабеларускай культуры. Паколькі экспанаванне калекцыі патрабавала фінансавых выдаткаў, уладальнік ужо не імкнуўся выкарыстоўваць яе ў выставачных мэтах. У хуткім часе правы на валоданне калекцыяй сталі перадавацца ад адной установы да другой.

Нягледзячы на шматлікія віртуальныя перамяшчэнні і змены ўладальнікаў, калекцыя з моманту збору ўвесь час знаходзілася на захаванні ў аддзеле старажытнабеларускай культуры.

У 2005 г. уладальнікам калекцыі становіцца Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк». У тым жа годзе кіраўніцтва банка прыняло рашэнне аб перадачы калекцыі Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі (цяпер – філіял Цэнтра).

З таго часу калекцыя актыўна прымяняецца ў навуковых і асветніцкіх мэтах. Яе матэрыялы апублікаваны ў шэрагу выданняў. У 2009 г. выйшаў ілюстраваны каталог калекцыі з паэтычнай назвай «Скарбы з вясковых куфраў» [1]. Матэрыялы калекцыі скарыстаны для напісання шматлікіх навуковых артыкулаў, яны ўпрыгожылі альбом «Традыцыйны беларускі касцюм», выдадзены ў 2016 г. [2].

Беларускія традыцыйныя строі, сфарміраваныя з прадметаў дадзенай калекцыі, пабывалі на многіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках (Ерэван, 2005 г.; Лондан і Парыж, 2012 г.; Варонеж, 2015 г.; Варшава, 2017 г. і інш.). З верасня 2023 г. строі з так званай банкаўскай калекцыі разам з іншымі музейнымі прадметамі са збору аддзела старажытнабеларускай культуры дэманстраваліся на маштабнай выстаўцы «Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм» у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь.

Сімвалічным з'яўляецца той факт, што калекцыя, перададзеная Беларусбанкам у навуковую ўстанову Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вяртаецца ў банкаўскую сферу ў выглядзе выяў традыцыйнага беларускага касцюма на памятных манетах Нацыянальнага банка. Супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі выратавалі ад знікнення важную частку культурнай спадчыны беларусаў і надалі ёй новае жыццё, а супрацоўнікі Нацыянальнага банка ўвекавечылі гэту спадчыну ў метале.

## Бібліяграфічны спіс

1. Віннікава, М.М. Скарбы з вясковых куфраў: Традыцыйны касцюм і тэкстыль з калекцыі «Народнае мастацтва Беларускага Палесся»: ілюстраваны каталог / М.М. Віннікава, П.А. Богдан. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2009. – 184 с.: іл.
2. Віннікава, М.М. Традыцыйны беларускі касцюм = Традиционный белорусский костюм = Traditional belarussian costume: альбом / М.М. Віннікава, П.А. Богдан. – Мінск: Беларус. навука, 2016. – 302 с.: іл.

## Traditional Belarusian Costume on Commemorative Coins: Ethnic Marker and Artistic Image

**Marya VINNIKOVA,** Center for the Study of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus, Senior Researcher of the Department of Ancient Belarusian Culture of the Institute of Art History, Ethnography and Folklore named after Kondrat Krapiva, Candidate of Art History, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: marya_vinnikova@tut.by

**Abstract.** The article is devoted to the history of creation of commemorative coins of the “Belarusian Costume” Series. The author notes that the tasks were interesting, but not easy. The image on the coin should be a kind of ethnic marker, correspond to the mentality of the people and convey the distinctiveness and artistic value of the traditional Belarusian costume.